экономический союз, а также инициатива Экономического пояса Шелкового пути.

### Литература и источники

1. Inglehart, R. Modernization and Postmodernization: Cultural, Economic, and Political Change in 43 Societies / Ronald Inglehart. – Princeton University Press, 1997.
2. Inglehart, R. Modernization, Cultural Change, and Democracy: The Human Development Sequence / Ronald Inglehart and Christian Welzel. – Cambridge University Press, 2005.
3. Бек У. Общество риска: На пути к другому модерну / Пер. с нем. В. Седельника, Н. Федоровой. – М.: Прогресс-Традиция, 2000.
4. Beck, U. The Theory of Reflexive Modernization: Problematic, Hypotheses and Research Programme / Ulrich Beck, Wolfgang Bonss, Christoph Lau // Theory, Culture & Society. – 2003. – № 20. – P. 1–33.
5. Гавров, С.Н. «Модернизация России: постимперский транзит» / предисл. Л.С. Перепелкин. – University of Nebraska – Lincoln, 2009.
6. Dutkiewicz, P. Democracy versus Modernization. A Dilemma for Russia and for the World / P. Dutkiewicz, V. Inozemtsev. – London/New York: Routledge, 2012.
7. Ковалев, М.М. Экономическая модернизация как строительство экономики знаний / М.М. Ковалев, С.И. Пасеко, Лю Цзэпин // Вестник БГУ. Серия 3. – 2011. – № 3. – С. 102–107.
8. Соколова, Г.Н. Модернизация как технологический и социальный феномен: Беларусь – Россия // Социологические исследования. – 2012. – № 5. – С. 4–19.
9. Буров, В.Г., Федотова В.Г. Китайский опыт модернизации: теория и практика // Вопросы философии. – 2007. – №5.
10. Просеков, С.А. Социально-философский анализ модернизации современного Китая в условиях глобализации. – М.: Финакадемия, 2009.

## ІНТЭГРАЦЫЯ БЕЖАНЦА Ў ГРАМАДСТВЕ Ў КАНТЭКСЦЕ РАЗВІЦЦЯ МІГРАЦЫЙНЫХ ПРАЦЭСАЎ

*Нашчынец К. М. (Минск, Беларусь)*

Сёння, падчас развіцця Еўрапейскага міграцыйнага крызісу (узнік у выніку шматразовага павелічэння патоку бежанцаў і нелегальных мігрантаў з краін Паўночнай Афрыкі, Блізкага Усходу, Паўднёвай Азіі і негатоўнасцю ЕС да іх прыёму і размеркавання. За 2015 г. у ЕС прыбыла каля 1,8 млн. мігрантаў. Цяперашні міграцыйны крызіс – найбуйнейшы з часоў Другой сусветнай вайны. Яго асноўнымі прычынамі сталі грамадзянская вайна ў Сірыі, пашырэнне тэрыторый, што знаходзяцца пад кантролем Ісламскай дзяржавы, грамадзянская вайна ў Лівіі, адкрыццё бежанцамі больш бяспечнага маршруту праз Міжземнае мора, Грэцыю і Македонію, замест старога праз Міжземнае мора, Лівію і Італію), вырашэнне праблем інтэграцыі мігрантаў з’яўляецца як ніколі важным і абумоўлівае неабходнасць аналізу эфектыўнасці шляхоў інтэграцыі бежанца ў грамадстве.

Тэрмін «інтэграцыя» быў уведзены Гербертам Спэнсэрам, англійскім



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

філосафам і сацыёлагам, адным з родапачынальнікаў эвалюцыянізму, у другой палове XIX ст. у дачыненні да тэорыі эвалюцыі. З часам значэнне паняцця змяніла свой сэнс і стала шырока ўжывацца ў многіх галінах [1]. Пад сацыяльнай інтэграцыяй варта разумець прыняцце індывіда іншымі членамі групы, працэс устанаўлення аптымальных сувязяў паміж адносна самастойнымі малазвязанымі сацыяльнымі аб'ектамі (індывідамі, групамі, сацыяльнымі класамі) і далейшае іх ператварэнне ў адзіную, цэласную сістэму, часткі якой узгодненыя і ўзаемазалежныя на аснове агульных мэтаў і інтарэсаў [2].

Распаўсюджаная памылка грамадскай думкі заключаецца ў тым, што інтэграцыя мігранта – хуткі працэс. Але падобнае амаль немагчыма рэалізаваць на працягу жыцця нават аднаго пакалення. Інтэграцыя – шматпакаленны працэс. Лічыцца, што інтэграцыя – становішча, калі мігранты атрымліваюць даступнасць да жылля, заробак, адэкватны ўзроўню заробку мясцовага насельніцтва і да т.п. Гэта эканамічныя ўмовы, неабходныя для інтэграцыі, яе важнейшыя перадумовы, але яшчэ не сама інтэграцыя [3].

Сапраўдная інтэграцыя адбываецца, калі чалавек адчувае, што ён прадстаўнік менавіта гэтага соцыума. Напрыклад, у горадзе Адэса ёсць грэчаская вуліца, яўрэйскі квартал, балгарская вуліца і іншыя. Аднак сярод мясцовага насельніцтва асабліва нікога не адрозніваюць – ні грэкаў, ні балгараў, ні яўрэяў. Людзі складаюць адзін соцыум, усе лічаць сябе адэсітамі, што з'яўляецца сапраўдным прыкладам абсалютна інтэграванага грамадства. У нашай краіне такім прыкладам можа служыць горад Іўе (раённы цэнтр Гродзенскай вобласці), у якім са старажытных часоў мірна суіснуюць жыхары зусім розных народнасцяў, сярод якіх прадстаўнікі 4 рэлігійных канфесій: праваслаўя, каталіцызму, іўдаізму і ісламу.

Глабальнай рызыкай міграцыйных працэсаў з'яўляецца тое, што спроба інтэграцыі мігрантаў пагражае пранікненнем на тэрыторыю краіны тэрарыстаў у патоку іншых бежанцаў. На меры па прадухіленні гэтай пагрозы сыходзяць асноўныя сілы службаў бяспекі. З-за пачуцця адасобленасці ад роднай культуры, якое мігранты адчуваюць ў новай краіне, узрастае небяспека іх радыкалізацыі, што ў сваю чаргу, звязана з праблемамі інтэграцыі. Менавіта праблемы інтэграцыі ляжаць у аснове радыкалісцкіх настрояў, а ў крайніх выпадках – і тэрарызму [4].

Сярод найбольш вострых пытанняў у сферы інтэграцыі, якія патрабуюць асаблівай увагі, неабходна вылучыць наступныя:

– адсутнасць распрацаванай комплекснай стратэгіі інтэграцыі бежанцаў;

– адсутнасць дасведчанасці аб праблемах бежанцаў і разумення іх праблем з боку цэнтральных і мясцовых органаў улады;

– адсутнасць дасведчанасці саміх бежанцаў аб сваіх правах і абавязках;

– залежнасць бежанцаў ад знешняй дапамогі (Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў (далей – УВКБ ААН), дзяржаўныя органы, грамадскія арганізацыі) і/або нежаданне бежанцаў праяўляць



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

уласную ініцыятыву ў вырашэнні інтэграцыйных пытанняў.

Адным з найбольш эфектыўных шляхоў да інтэграцыі з’яўляецца працаўладкаванне мігранта на новым месцы. Без працы інтэграцыя немагчымая, а самі ўцекачы ператвараюцца ў непасільны цяжар для дзяржаўнага бюджэту. У сваёй пераважнай большасці мігранты адпавядаюць патрабаванням толькі нізкакваліфікаваных спецыяльнасцяў. Але заключэнне спецыялістаў адназначна: нізкакваліфікаваная сіла ў такіх колькасцях не можа быць працаўладкавана. У выніку чаго паўстае новая праблема – сацыяльна-эканамічная. Існуюць прыклады Германіі і Францыі, куды ў 1960–1970 гг. прыбылі мільёны мігрантаў з краін Афрыкі і Блізкага Усходу, якія атрымалі працу ў сектары абслугоўвання, на будоўлях і ў аўтапраме. З часам патрэба ў гэтай рабочай сіле адпала, аднак мігранты засталіся ў Еўропе, перайшоўшы на сацыяльную дапамогу. Менавіта ў іх асяроддзі сфарміравалася субкультура, якая адмаўляе еўрапейскія працоўныя і цывілізацыйныя каштоўнасці [5].

Значная роля ў працы з бежанцамі адводзіцца і грамадскім арганізацыям. Яны спрыяюць інтэграцыі бежанцаў, дапамагаюць ім фарміраваць уласныя аб'яднанні і падтрымліваць адзін аднаго. У Рэспубліцы Беларусь варта падкрэсліць дзейнасць праекту «Мясцовая інтэграцыя бежанцаў у Беларусі», міжнароднага грамадскага аб'яднання па навукова-даследчых і інфармацыйна-адукацыйных праграмах «Развіццё», цэнтр творчасці дзяцей і моладзі «Эўрыка» [6]. Ацэньваючы ролю УВКБ ААН у інтэграцыі бежанцаў як у замежных краінах, так і Беларусі, неабходна падкрэсліць наступны факт: УВКБ ААН штогод рэалізуе ў Беларусі праекты на суму 1 000 000 $, якія ў асноўным накіраваны на ўмацаванне нацыянальнай сістэмы прыстанішча і патэнцыялу лакальнай інтэграцыі [7].

Падводзячы вынікі, трэба яшчэ раз заўважыць, што адным з найбольш эфектыўных шляхоў інтэграцыі бежанца з’яўляецца прадастаўленне яму працоўнага месца. Але адначасова з’яўляецца і негатыўны бок дадзенага працэсу: павялічваецца беспрацоўе, мігранты не заўсёды адпавядаюць высокім патрабаванням, павялічваюцца сацыяльныя выплаты і выдаткі. Таксама, асаблівыя намаганні трэба засяродзіць і ў сферы адукацыі (лягчэй ўсё новыя веды набываюцца ў дашкольным узросце, а працэс акліматызацыі ў краіне, распачаты ў першыя гады жыцця, з’яўляецца найбольш эфектыўным і хуткім). Акрамя таго, мэтазгодна засяродзіць увагу на той акалічнасці, што ва ўрадзе дзяржавы механізм паспяховай інтэграцыі мігранта не можа забяспечыць толькі адно ведамства (у Рэспубліцы Беларусь, напрыклад, Дэпартамент па грамадзянству і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў). Вырашэнне праблем інтэграцыі з боку Урада дзяржавы – цяжкая і ўзаемазвязаная праца шматлікіх дзяржаўных органаў, якія разам павінны ўзгадняць і планаваць сваю палітыку ў дадзеным накірунку.



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm

## Літаратура і крыніцы

1. Социология Герберта Спенсера [Электронный ресурс] / Энциклопедия Экономиста. – Режим доступа: http://www.grandars.ru/ college/ sociologiya/ gerbert-spenser.html.
2. Интеграция социальная [Электронный ресурс] / Словари и энциклопедии Академика. – Режим доступа: http://dic.academic.ru/ dic.nsf/ socio/ 1277/%D0%98%D0%9D%D0%A2%D0%95%D0%93%D0%A0%D0%90%D0%A6%D0%98%D0%AF.
3. Интеграция мигрантов – это путь многих поколений [Электронный ресурс] / Goethe Institut. – Режим доступа: http://www.goethe.de/ ins/ ru/ lp/ kul/ dur/ mig/ ide/ ru6723067.htm.
4. Сроки интеграции иммигрантов в Финляндии [Электронный ресурс]/ Новостная лента Norse.ru. – Режим доступа: http://norse.ru/ pub/ 64.html.
5. Смогут ли беженцы найти работу в Европе? [Электронный ресурс] / Иностранные СМИ.РУ. – Режим доступа: http://inosmi.ru/ op_ed/ 20151102/ 231146345.html.
6. Матус, С.А. Интеграция беженцев в Республике Беларусь/ С.А. Матус, Т.В. Тумашик // Журнал международного права и международных отношений. – 2007. – № 4. – С. 37–43.
7. Упраўленне Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў [Электронны рэсурс]/ Міністэрства замежных спраў Рэспублікі Беларусь. – Рэжым доступу: http://mfa.gov.by/ mulateral/ organization/ list/ bel/ a4d9197f6819d0d9.html.


# РЕСПУБЛИКА БЕЛАРУСЬ В КОНТЕКСТЕ ПОСТРОЕНИЯ ИННОВАЦИОННОЙ ЭКОНОМИКИ

*Никитина Ю. Ф. (Минск, Беларусь)*

После распада СССР перед постсоветскими странами встала сложная историческая задача – войти в мировую экономическую систему. Однако тяжелое экономическое положение нашей страны в первое десятилетие суверенитета негативно сказалась на фундаментальной и отраслевой науке, что повлекло за собой неэффективное решение на протяжении длительного времени проблем создания высоких технологий, использования накопленного научно-технического, производственного, интеллектуального и кадрового потенциала, и, в конечном итоге, обусловило технологическое отставание Республики Беларусь от высокоразвитых стран. Тем не менее, для того, чтобы обеспечить устойчивое экономическое развитие страны, национальную безопасность и социальное благополучие, на протяжении последних пятнадцати лет в Республике Беларусь достаточно четко определена стратегия национальной политики в отношении науки и инноваций как важнейших факторов социально-экономического развития. Но в силу того, что передовые технологические страны, прежде всего речь идет о США, Японии и Евросоюзе, гораздо раньше перешедших к построению инновационной экономики, уже фактически создали единое технологическое пространство, в сложившейся ситуации Республике



This document has been edited with Infix PDF Editor - free for non-commercial use.
To remove this notice, visit: www.iceni.com/unlock.htm